# Тэма 6. ГЕАГРАФІЯ ГАСПАДАРКІ І ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНЫЯ СУВЯЗІ БЕЛАРУСІ

## § 26. Галіновая і тэрытарыяльная структура нацыянальнай эканомікі

***Узгадваем.*** *Якія эканамічныя паказчыкі характарызуюць гаспадарчую дзейнасць розных краін? На якія сектары падзяляецца сусветная эканоміка? Чаму краіны займаюцца рознымі відамі эканамічнай дзейнасці?*

**Нацыянальная эканоміка Беларусі.** Нацыянальная эканоміка любой краіны — гэта складаная гаспадарчая і сацыяльная сістэма. Яна мае галіновую і тэрытарыяльную структуру. Сучасная эканоміка Беларусі фарміравалася на працягу доўгага часу ў выніку гістарычнага развіцця ў адпаведнасці з прыроднымі ўмовамі і рэсурсамі тэрыторыі, асаблівасцямі насельніцтва і дэмаграфічнага развіцця.

Асноўным эканамічным паказчыкам, які характарызуе нацыянальную эканоміку, з'яўляецца валавы ўнутраны прадукт (ВУП). *Што такое ВУП і як ён вызначаецца?* ВУП Беларусі рэзка скараціўся ў 1991 г. падчас эканамічнага крызісу, які перажывала краіна пасля распаду СССР. Калі ў 1990-я гг. дынаміка ВУП характарызавалася няўстойлівасцю, то пачынаючы з 2000 г. краіна выйшла на адносна ўстойлівы рост гэтага паказчыка, хаця у асобныя гады тэмпы эканамічнага росту істотна вагаліся (мал. 104). За 2010–2017 гг. ВУП краіны павялічыўся на 14 % і складае больш за 105,2 млрд руб.

Галоўнымі паказчыкамі, якія вызначаюць узровень эканамічнага развіцця і якасць жыцця насельніцтва краіны, з'яўляюцца ВУП на душу насельніцтва і індэкс чалавечага развіцця (ІЧР). ВУП на душу насельніцтва па афіцыйным абменным курсе складае каля 6 тыс. дол. ЗША. Больш высокі паказчык сярод краін СНД толькі ў Расіі і Казахстана. Па ІЧР Беларусь уваходзіць у групу краін з вельмі высокім узроўнем чалавечага развіцця, дзе займае 53-е месца.

Кожная краіна развівае сваю эканоміку па пэўнай мадэлі. Рэспубліка Беларусь у якасці мадэлі выкарыстоўвае *сацыяльна-арыентаваную рыначную эканоміку*. У апошні час эканоміка Беларусі развіваецца па інавацыйным шляху: адбываецца рэканструкцыя і мадэрнізацыя вытворчых магутнасцей, укараняюцца найноўшыя тэхналогіі, ствараюцца тэхнапаркі, Парк высокіх тэхналогій.




Мал. 104. Дынаміка ВУП Беларусі

**Сучасная структура эканомікі Беларусі.** У сацыяльна-эканамічнай геаграфіі вылучаецца галіновая і тэрытарыяльная **структура гаспадаркі**.

**Галіновая структура гаспадаркі** — гэта сукупнасць галін і відаў гаспадарчай дзейнасці краіны, якая характарызуецца іх колькаснымі суадносінамі і ўзаемасувязямі.

Фарміруецца галіновая структура гаспадаркі ў выніку грамадскага і тэрытарыяльнага падзелу працы. Найбольшы ўплыў на яе аказваюць прыродныя ўмовы і рэсурсы, патрэбы ўнутранага і знешняга рынкаў, навукова-тэхнічны прагрэс. Гаспадарчы комплекс краіны ахоплівае розныя *галіны вытворчасці* і *віды эканамічнай дзейнасці*.

Гаспадарка краіны падзяляецца на сферы матэрыяльнай (сфера вытворчасці) і нематэрыяльнай вытворчасці (сфера паслуг), а яны, у сваю чаргу, — на галіны і падгаліны. Асноўным злучальным элементам галіны з'яўляецца аднатыпны тэхналагічны працэс. У сістэме адміністрацыйнага кіравання эканомікай Беларусі галіновы прынцып захоўваецца. У пачатку XXI ст. ва ўмовах уніфікацыі з Расіяй падыходаў да статыстычнай ацэнкі галіновай структуры эканомікі ў рэспубліцы быў распрацаваны і ўведзены класіфікатар відаў эканамічнай дзейнасці, які дазваляе супастаўляць эканоміку Беларусі з большасцю краін свету. У галіновай структуры гаспадаркі віды эканамічнай дзейнасці аб'ядналіся ў групы (мал. 105).




Мал. 105. Групоўка асноўных відаў эканамічнай дзейнасці і галін у структуры гаспадаркі Беларусі

У перыяд індустрыяльнага развіцця нацыянальныя эканомікі краін раслі за кошт сферы вытворчасці. У цяперашні час развітыя краіны перайшлі на новую стадыю эканамічнага развіцця — постіндустрыяльную. Рэспубліка Беларусь характарызуецца блізкімі паказчыкамі долі ВУП сферы вытворчасці і сферы паслуг (мал. 106). Пры гэтым доля сферы паслуг штогод павялічваецца.




Мал. 106. Дынаміка ўдзельнай вагі сферы вытворчасці і сферы паслуг у ВУП Беларусі, %

Асновай сучаснага вытворчага патэнцыялу Беларусі застаецца прамысловасць, на долю якой у апошняе пяцігоддзе прыпадае каля 25 % аб'ёму ВУП. У цяперашні час у Беларусі налічваецца звыш 14 тыс. прамысловых арганізацый. У адпаведнасці з класіфікацыяй відаў эканамічнай дзейнасці да іх адносяцца прадпрыемствы горназдабыўной і апрацоўчай прамысловасці, а таксама прадпрыемствы, якія займаюцца вытворчасцю і забеспячэннем электраэнергіяй, газам і вадой, выдаленнем і перапрацоўкай адходаў.

Вядучая роля ў прамысловасці належыць апрацоўчым вытворчасцям, доля якіх складае 88 % аб'ёму прамысловай вытворчасці (мал. 107). У былым СССР Беларусь лічылася «зборачным цэхам», бо




Мал. 107. Структура гаспадаркі Беларусі, %

ў краіне размяшчаліся завяршальныя стадыі машынабудаўнічай вытворчасці. У галіновай структуры назіраецца высокая ўдзельная вага машынабудавання, хімічнай, нафтаперапрацоўчай і харчовай прамысловасці.

Важнымі складнікамі сферы вытворчасці Беларусі з'яўляюцца сельская, лясная і рыбная гаспадарка, на долю якіх у апошнія гады прыходзіцца каля 8 % аб'ёму ВУП, а таксама будаўніцтва, доля якога ў структуры ВУП у апошнія гады некалькі знізілася і складае крыху больш за 5 %.

**Тэрытарыяльная структура эканомікі.** *Тэрытарыяльная структура эканомікі* вызначаецца размяшчэннем розных галін сферы вытворчасці і сферы паслуг, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Яна цесна звязана з рассяленнем, транспартнай сеткай, асаблівасцямі прыроднага асяроддзя і прыродных рэсурсаў.

Элементы тэрытарыяльнай структуры могуць мець розныя формы. Так, сельская і лясная гаспадарка, здабыўная прамысловасць, залежныя ад прыродных рэсурсаў, маюць у асноўным арэальныя формы: сельскагаспадарчыя зоны, горназдабыўныя басейны і г. д. Прадпрыемствы апрацоўчай прамысловасці размешчаны ў населеных пунктах і ўтвараюць такія элементы тэрытарыяльнай структуры, як прамысловыя пункты, цэнтры і вузлы. Асобныя вытворчасці маюць куставую форму тэрытарыяльнай структуры з галоўным прадпрыемствам і пастаўшчыкамі асобных дэталей і вузлоў. Транспарт прадстаўлены пераважна лінейнымі формамі тэрытарыяльнай структуры.

**Умовы і фактары размяшчэння вытворчасці.** Для вызначэння аптымальнага размяшчэння галін гаспадаркі ўстанаўліваецца ступень уплыву сыравінных, паліўна-энергетычных і працоўных рэсурсаў, геаграфічнага становішча на кожную вытворчасць. Размяшчэнне асобных галін гаспадаркі адбываецца пад уздзеяннем гістарычна і эканамічна склаўшыхся ўмоў і фактараў. Па меры развіцця грамадства значнасць фактараў змяняецца.

Размяшчэнне аб'ектаў сферы вытворчасці і сферы паслуг залежыць ад *прыродных умоў тэрыторыі* і *эканоміка-геаграфічнага становішча*. На размяшчэнне вытворчасці аказвае ўплыў плошча Беларусі, размяшчэнне буйных гарадоў, асвоенасць тэрыторыі. Прамыслова-гаспадарчыя цэнтры размяшчаюцца па ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Рэгіёны Беларусі адрозніваюцца забяспечанасцю прыроднымі рэсурсамі. *Якія фізіка-геаграфічныя рэгіёны вылучаюцца ў краіне і якія прыродна-рэсурсны патэнцыял характэрны для іх?* Размяшчэнне энерга- і матэрыялаёмістых галін прамысловасці, сельскагаспадарчай вытворчасці,

некаторых аб’ектаў сферы паслуг залежыць ад *прыродна-рэсурснага патэнцыялу*.

Беларусь характарызуецца спрыяльнымі прыроднымі ўмовамі для розных відаў гаспадарчай дзейнасці: слабое расчляненне рэльефу і невялікія яго адносныя перавышэнні спрыяюць будаўніцтву дарог і гаспадарчых аб’ектаў; тэмпературы, колькасць ападкаў і іншыя кліматычныя паказчыкі спрыяюць сельскагаспадарчай і рэкрэацыйнай дзейнасці; забяспечанасць падземнымі і паверхневымі водамі спрыяе развіццю вадаёмістых вытворчасцей, стварэнню зон адпачынку. Якія яшчэ прыродныя ўмовы аказваюць спрыяльны ўплыў на развіццё эканомікі, а якія стрымліваюць яго?

Часта ўмовы развіцця вытворчасці праяўляюцца праз сыравінны і паліўна-энергетычны фактары, паколькі адны прадпрыемствы залежаць ад наяўнасці сыравіны (напрыклад, вытворчасць калійных угнаенняў, хімічных валокнаў, металаёмістае машынабудаванне), а іншыя — ад наяўнасці энергіі (напрыклад, вытворчасць штучных валокнаў або металургічная вытворчасць). На сучасным этапе роля дадзенага фактару зніжаецца, паколькі ўзрастае залежнасць эканомікі ад фінансавых і інфармацыйных патокаў.

*Эканоміка-геаграфічнае становішча* (ЭГС) краіны і асобных рэгіёнаў унутры яе таксама аказвае ўплыў на асаблівасці размяшчэння сферы вытворчасці і сферы паслуг. Вельмі важным з’яўляецца становішча рэгіёна адносна шляхоў зносін, патокаў сыравіны і энергіі, блізкасці да рынкаў збыту гатовай прадукцыі. У сучасную эпоху глабалізацыі значнасць ЭГС не страчваецца.

На размяшчэнне вытворчасці аказвае ўплыў *працоўнарэсурсны* фактар. Размяшчэнне адных галін арыентуецца на колькасць працоўных рэсурсаў, а іншых — на іх якасць. Сярод краін Еўропы Беларусь вылучаецца дастатковай колькасцю працоўных рэсурсаў, высокім узроўнем іх адукацыі і кваліфікацыі, працоўнай актыўнасці і дысцыпліны. Пра павышэнне значэння дадзенага фактару сведчыць развіццё навука- і працаёмістых галін і вытворчасцей і іх канцэнтрацыя ў буйных гарадах.

Для многіх вытворчасцей тавараў і ў большай ступені вытворчасцей паслуг галоўным выступае *спажывецкі фактар*. Асабліва вялікі ўплыў ён аказвае на вытворчасць хуткапсавальнай прадукцыі харчовай прамысловасці, развіццё асобных галін сельскай гаспадаркі, гандаль, гасцінічную гаспадарку, грамадскае харчаванне і іншыя галіны сферы паслуг. *Чаму большае развіццё дадзены фактар атрымаў у гарадах?*

У цяперашні час у краіне рэалізуецца Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 (НСУР-2030), у адпаведнасці з якой эканамічнае і сацыяльнае развіццё ўзгадняецца з экалагічным. Размяшчэнне многіх вытворчасцей Беларусі вызначаецца *экалагічным фактарам*. У цяперашні час значнасць экалагічнага фактару павышаецца.

Да фактараў размяшчэння гаспадаркі Беларусі адносіцца *транспартна-інфраструктурны*. Транспарт і сувязь на сучасным этапе памяншаюць значэнне спажывецкага фактару, паколькі зніжаюць залежнасць рэалізацыі прадукцыі ад адлегласці яе дастаўкі да спажыўца. У той жа час выгаднае транспартнае становішча памяншае залежнасць вытворчасці прадукцыі ад сыравіннага фактару.

У эпоху НТР на размяшчэнне галін гаспадарчага комплексу павялічыўся ўплыў такога фактару, як *развіццё навукова-тэхнічнага патэнцыялу*. Шэраг вытворчых прадпрыемстваў размяшчаецца побач з профільнымі навуковымі ўстановамі. Многія прадпрыемствы арыентуюцца на прадпрыемствы Парку высокіх тэхналогій, навукова-даследчыя інстытуты НАН Беларусі. Усё большы ўплыў на размяшчэнне сферы вытворчасці і сферы паслуг Беларусі аказваюць інавацыйныя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

Сярод фактараў размяшчэння гаспадаркі ў Беларусі варта адзначыць тэрытарыяльнае планаванне ў рамках *дзяржаўнай рэгіянальнай палітыкі*, якая прагназуе развіццё гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі краіны.

**Асаблівасці галіновай структуры гаспадаркі рэгіёнаў Беларусі.** Тэрытарыяльная структура эканомікі краіны адлюстроўвае прасторавыя асаблівасці размеркавання гаспадарчай дзейнасці, у тым ліку ролю асобных рэгіёнаў у фарміраванні ВУП і іх спецыялізацыю. Для ацэнкі ўзроўню развіцця вытворчасці ў абласцях і г. Мінску выкарыстоўваецца паказчык валавога рэгіянальнага прадукту (ВРП), аналагічны ВУП. Па ўдзельнай вазе ВРП у ВУП краіны лідзіруе Мінск — 26,9 %. Амаль удвая меншая доля Мінскай вобласці — 14,6 % (мал. 108). Найменшы эканамічны патэнцыял сярод абласцей Беларусі мае Магілёўская вобласць.

Таксама ёсць адрозненні ў структуры ВРП. Найбольш высокая доля прамысловасці назіраецца ў Мінскай і Гомельскай абласцях, а самая нізкая — у Мінску. У той жа час Мінск вылучаецца высокай удзельнай вагой галін сферы паслуг (73,9 %). Найбольшая доля сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі ў ВРП адзначана ў Брэсцкай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях.




Мал. 108. Рэгіянальная структура ВУП, 2017 г., %

**Найважнейшыя сацыяльна-эканамічныя цэнтры краіны.** У рэгіянальным развіцці Беларусі назіраецца заканамерны працэс тэрытарыяльнай канцэнтрацыі вытворчасці і насельніцтва ў г. Мінску. Для сеткі гарадскіх паселішчаў характэрны больш хуткі рост буйных гарадоў і паселішчаў, размешчаных у Мінскай агламерацыі і іншых рэгіянальных цэнтрах. Гарады характарызуюцца развіццём большай колькасці відаў эканамічнай дзейнасці. Асабліва гэта датычыцца сферы паслуг.

На базе гарадоў фарміруюцца сацыяльна-эканамічныя цэнтры краіны. Па аб'ёмах вытворчасці іх можна падзяліць на буйнейшыя, буйныя, сярэднія, малыя і дробныя. Найбольшае значэнне ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны і ў тэрытарыяльнай структуры ВУП адыгрываюць буйнейшыя (Мінск) і буйныя прамысловыя цэнтры. Мінск мае найбольш разгалінаваную структуру эканомікі, у якой прадстаўлены практычна ўсе віды эканамічнай дзейнасці, якія адносяцца да нематэрыяльнай сферы.

18 гарадоў Беларусі па аб'ёмах прамысловай вытворчасці адносяцца да катэгорыі буйных прамысловых цэнтраў.

Знайдзіце на карце атласа (с. 37) буйныя прамысловыя цэнтры. Прааналізуйце структуру іх прамысловасці і растлумачце, чаму яны адносяцца да важнейшых.

Буйныя прамысловыя цэнтры характарызуюцца развітой не толькі шматгаліновай прамысловасцю, але і сферай паслуг. За малым выключэннем яны выконваюць і адміністрацыйна-кіраўніцкія функцыі, з'яўляючыся цэнтрамі адміністрацыйных раёнаў. Выключэнне — некаторыя гарады абласнога падпарадкавання (Жодзіна і Наваполацк), якія з'яўляюцца буйнымі прамысловымі цэнтрамі, не будучы адміністрацыйнымі цэнтрамі раёнаў.

**Абагульнім і запомнім.** Эканоміка Беларусі мае галіновую і тэрытарыяльную структуру. ВУП рэспублікі складае 105,2 млрд руб., ВУП на душу насельніцтва — каля 6 тыс. дол. ЗША. Гаспадарка Беларусі падзяляецца на вытворчую сферу і сферу паслуг, доля якіх у ВУП краіны прыкладна роўная. Размяшчэнне галін гаспадаркі залежыць ад памераў тэрыторыі, прыродна-рэсурснага патэнцыялу, эканоміка-геаграфічнага становішча, працоўных рэсурсаў, спажывецкага, экалагічнага, транспартнага, інфармацыйнага і іншых фактараў.

1. Як змяняецца ВУП краіны на сучасным этапе развіцця эканомікі? 2. На якія сферы падзяляецца эканоміка Беларусі? 3. Якія ўмовы і фактары ўплываюць на размяшчэнне вытворчасці ў Беларусі? 4. Які цэнтр прамысловай вытворчасці адносіцца да буйнейшых па аб'ёмах вытворчасці?

5. Чаму апошнім часам віды эканамічнай дзейнасці замяняюць традыцыйныя галіны вытворчасці? 6. Чаму эканоміку Беларусі называюць сацыяльна-арыентаванай рыначнай? 7. Пералічыце па пяць відаў прамысловай прадукцыі, вытворчасць якіх залежыць у асноўным ад сыравіннага і паліўна-энергетычнага фактараў. 8 Растлумачце, якія галіны гаспадаркі і чаму арыентуюцца на спажыўца. 9. Якія галіны развіваюцца ў адпаведнасці з прыроднымі і экалагічнымі ўмовамі?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Карыстаючыся данымі атласа і рэсурсамі сеткі Інтэрнэт, падрыхтуйце паведамленне пра структуру ВРП вашай вобласці.

## § 27. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Геаграфія раслінаводства

***Узгадваем.*** *На якія падгаліны падзяляецца сельская гаспадарка? У чым асаблівасці агракліматычных рэсурсаў Беларусі?*

**Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны.** Асноўная задача сельскай гаспадаркі — задавальненне попыту насельніцтва на прадукты харчавання, а таксама забеспячэнне прадпрыемстваў харчовай і лёгкай прамысловасці сыравінай. Сельскагаспадарчая вытворчасць з'яўляецца асноўным відам занятасці ў сельскай мясцовасці. На долю сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі ў Беларусі цяпер прыходзіцца 7,8 % ВУП, у ёй занята амаль 10 % працаздольнага насельніцтва. Спецыялізуецца сельская гаспадарка на вытворчасці малака і мяса, збожжавых культур, бульбы, цукровых буракоў і лёну. Беларусь амаль цалкам забяспечвае сябе харчаваннем: імпарт складае менш за 10 % усяго аб'ёму спажывання.